раман. Праблема развіцця беларускага рамана - важная частка агульнай праблемы развіцця рэалістычнага напрамку ў літаратурным працэсе. Гэтая складаная і неаднародная з'ява адлюстравала ў сваім развіцці спецыфічныя бакі грамадства. Усе праблемы рамана як жанру будуць вывучацца ў суадносінах агульнага і індывідуальна-непаўторнага, з захаваннем сацыяльна-структурнага прынцыпу літаратурных з'яў у грамадска-гістарычным плане, з устанаўленнем значэння буйных мастацкіх адкрыццяў найбольш значных празаікаў.

Асноўная задача спецкурса заключаецца ў праясненні тых важных момантаў у развіцці жанру рамана, якія дапамогуць студэнтам разабрацца ў складанай праблеме ролі і значэння рамана, развіццё якога звязана з лёсам усёй краіны, з асэнсаваннем тэмы гістарычнага мінулага нашага народа, з надзённымі палітычнымі патрэбамі бягучага дня. Фарміраванне ўяўленняў аб развіцці рамана, выпрацоўка крытэрыяў мастацкай дакладнасці ў ім дапамогуць выхаваць у студэнтаў лепшыя маральна-эстэтычныя прынцыпы і нормы.

Арцяшук С.М.,
выкладчык

## ПРАЗ МІНУЛАЕ - ДА БУДУЧЫНІ
(праблематыка творчасці М.Гарэцкага)

Сучаснае літаратуразнаўства захавала шмат станоўча традыцыйнага ў дачыненні да выкладання літаратуры як навуковага прадмета ў ВНУ. Аднак, якімі б выдатнымі ні былі старыя спосабы, дзень сённяшні вымагае перагляду традыцыйнага і пошуку новага накірунку ў дачыненні да характарыстыкі асобных эпох, творчасці некаторых аўтараў і аналізу канкрэтных твораў.

Яскравы прыклад таму - маладаследаваная на сённяшні дзень творчасць Максіма Гарэцкага. Надзелены талентам ад прыроды, а таксама пільны як мастак, ён пакінуў спадчыну ўважлівага і глыбокага псіхолага чалавечай душы, застаючыся адначасова звычайным чалавекам, якому цяжка спасцігнуць тое «патаемнае», што лунае вакол людзей спрадвеку і да сёння не дае зразумець гэтае дзіўнае ўладкаванне сусвету і вызначыць сапраўднае месца чалавека ў ім.

Тая плынь свядомасці, што нараджае пытанні: «Адкуль усё?» і «Што яно?» - раз і назаўсёды ахапіла розум пісьменніка і вылілася ў яго творчасці. Тут хацелася б падкрэсліць, як важна зыходзіць у вытлумачэнні асобных літаратурных твораў ад падзей, звязаных з асобай самога аўтара, ад аўтабіяграфічных момантаў. З самага пачатку, ад ранніх творах сваіх, імкнецца ён, юнак Гарэцкі, наблізіцца да ведання таго, што, можа, чалавеку і не дадзена, але так адчайна імкнуцца зразумець яго героі, што так ярка і праніклівa выказана ў апавяданні «Што яно?»: «Хто можа знаць, адкуля жыццё? Адразу было многа людзей ці з аднаго пайшло? Як? Чаму ён не пераказаў унукам, адкуль ён, першы, узяўся?» Менавіта такія словы, такія пытанні сталі зыходным пунктам пошуку М.Гарэцкага, пошуку цяжкага і пакутлівага.

Ён нарадзіўся ў вёсцы, не дазволіў сапсаваць сябе гарадскім выхаваннем падчас вучобы там і абраў нялёгкі шлях да адраджэння роднай Беларусі. Шмат несправядлівасці зазнаў і нядолі, ды і загінуў, не зведаўшы належнай увагі і пашаны да сваёй творчасці. Але праз гады ён застаўся асобай, чалавекам, які пакінуў багатую творчую спадчыну, нягледзячы на незавершанасць многіх задум. І цяпер спадчына гэтая па праву ўваходзіць у скарбніцу беларускай класікі побач з творамі Купалы, Багдановіча, Коласа.

Свядомасць пісьменніка расла, відаць, не без дапамогі яго папярэднікаў у літаратуры. Ці не згадваў ён Коласавы «Казкі жыцця», калі вуснамі навучэнца пансіёна Кастуся Зарэмбы з апавядання «У чым яго крыўда?» прамаўляе: «Толькі мы гадуемся на чужым грунце і забываемся добра разумець свой грунт»? Мабыць, яго апаноўвалі тыя ж мары, што і Багдановіча, калі ён выказваў горача і шчыра: «Каб нам, ведаеш, свой беларускі прарок, каторы б прамыў нам вочы, у чым наша істота, паэзія жыцця, прыгажосць жыцця. ... Ці навучыла нас, слухай, наша школа любіць сваё беларускае, шанаваць прыгажосць роднай прыроды, пранікнуцца гармоніяй родных з'яў? Чаму нас вучылі!» Так казаў ён, не ведаючы, што сам стане для Беларусі такім жа пракам, як і Колас, і Багдановіч.

Вечныя спробы зразумець жыццё. Вечнае расчараванне ў старым і складаны шлях да новага. Вялікая дасада, што ляжыць на сэрцы Антона з аднайменнай драмы М.Гарэцкага, гэтак жа ляжыць на сэрцах многіх людзей і цяпер. Ад самай першабытнасці аж да нашых дзён шукае чалавек паразумення з наваколлем і іншымі людзьмі. Асабліва ж зараз, у наш няпэўны ва ўсіх адносінах час, гэта відавочна. Ды і, мабыць, жыццё ніводнага пакалення людзей на гэтай зямлі не абыходзіцца без нейкіх катаклізмаў, пераломаў глабальнага характару. Таму чытанне твораў М.Гарэцкага вельмі сучаснае, а дакладней, яно у нейкай ступені нейтральнае па часе. Гэтая мудрасць прыдатная да любога часу, і гэтыя пакутлівыя пошукі сэнсу духоўнасці, раўнавагі - вечныя.